ТЭЛЕПРАГРАМА НА НАСТУПНЫ ТЫДЗЕНЬ – на 3-й старонцы



● Заснавана ў 1991 годзе ● № 31 (164) ● Чацвер, 6 верасня 2001 г. У розніцу кошт свабодны

НАВІНЫ, ПАДЗЕІ, ФАКТЫ

Аб сярэднемесячнай зарплаце

Як вядома, сярэдняя налічаная зарплата рабочым і служачым у ліпені 2001 года склала 144817 рублёў і ўзрасла супраць чэрвеньскай сярэдняй зарплаты на 14764 рублі. Рост заўважны. Калі пераўнаць курс долара, устаноўлены на 29 жніўня г.г. НБ РБ, то, выходзіць, што ўжо раней вызначанага Прэзідэнтам тэрміну, заветныя «сярэднія» 100 долараў дасягнуты.

А як жа ўзрос дабрабыт насельніцтва? Што далі заробкі ў 100 долараў?

У студзені 1995 года сярэдняя зарплата была 369619 рублёў (крыху больш 30 долараў). За месячную зарплату тады можна было купіць 382 боханы хлеба (967 рублёў за бохан).

У ліпені 2001 года сярэдняя зарплата дасягнула 100 долараў (144817 рублёў). За яе можна было купіць 367 боханаў хлеба (394 рублі за бохан) — на 15 боханаў менш, чым у студзені 1995 г. Дык што з таго, што зарабляем у сярэднім 100 долараў?

А прапаганда ў сродках дзяржаўных СМІ, па тэлебачанні і радыё штодзень дзячыць аб паляпшэнні нашага дабрабыту. А вы, многія, людзі добрыя — верыце, замест таго, каб падлічыць, што праўда, што брахня. А праўда ў тым, што з кожным годам мы жывём усё горш і горш. Заробкі нібыта растуць, а дабрабыт наш — усё ніжэй і ніжэй. Успомніце, пенсіянеры, «цяжкія сталінскія часы». Кожны год — зніжэнне цэн. Хоць заробкі і не вельмі падрасталі, а дабрабыт рос!

Пасля разбуральнай Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945 гадоў, за якія 10 год мы зажылі, як людзі. А за апошнія 7 год? Мы прыблізіліся да жабрацтва нават без вайны.

Ігар СЦЯПУРА,
г. Асіповічы.

Бедныя, але не жабракі

Беларуская дзяржава ў чарговы раз перагледзела ўзровень рысы беднасці: цяпер памер бюджэту пражытачнага мінімуму (БПМ) складае 51946 рублёў — каля 36 долараў у эквіваленце. У другім квартале года ён быў на 19% менш.

Напомнім, што па міжнародных стандартах жабракамі лічацца тыя грамадзяне, якія могуць затрачваць на жыццё не больш і долара ў дзень. Такім чынам, беларускія бедныя ўсё ж такі не жабракі. У той жа час цяперашні сярэдні ўзровень даходаў беларусаў, а новы БПМ раэлічваўся, зыходзячы з заробкаў рабочых і служачых у чэрвені ў памеры 130 тысяч рублёў — з эканамічнай кропкі погляду не дазваляе забяспечыць нават простага ўзнаўлення насельніцтва. Так, у сям'і двое працуючых бацькоў атрымліваюць (гэта ў сярэднім) у суме 2,64 БПМ, гэта значыць, што яны не ў стане нармальна забяспечыць нават аднаго дзіцяці!

А вядома ж, каб народанасельніцтва не змяншалася, трэба, каб у кожнай сям'і мелася трое дзяцей.

Язэп ШУЛЬГА,
г. Горкі.

Ці «лопне» долар ЗША?

Не так даўно па расійскіх каналах тэлебачання прагучала прароцтва эканаміста Таццяны Карагінай аб хуткім краху амерыканскага долара. Названы быў і дзень катастрофы —10-я гадавіна ГКЧП, 19-20 жніўня.

Гэтыя дні мінулі. А долар цэлы, як граніт. А наш «зайчык» зноў «з'ехаў уніз» супраць долара. Што ж дала падставы Карагінай прагназаваць рэзкую інфляцыю долара? Гэта — падзенне вытворчасці ў ЗША. Сапраўды, вытворчасць у апошні час у ЗША скарачаецца. Але гэта не крызіс. Хоць сапраўды ў ЗША спад вытворчасці ёсць, але гэта часовая з'ява і спад гэты не пагражальны. Бо сукупны ўнутраны валавы прадукт, ня гледзячы на спад вытворчасці, не зменшыўся, а ўзрос за другі квартал 2001 года на 0,2%.

Так што інфляцыя долару не пагражае. Ён яшчэ пакуль цвёрда трымаецца.

Сымон КОВАЛЬ,
г. Бабруйск.

Жанчыны ў кампаніі «Выбірай»

Магілёў. Тут адбылося пяць навучальных семінараў для актывістаў кампаніі «Выбірай». Навучанне прайшлі сябры ТБМ, Беларускай арганізацыі працоўных жанчынаў, МФ, кааліцыі, дэмакратычных арганізацыяў г. Горкі і моладзёвай кааліцыі «Пераменаў»!

Падчас семінараў удзельнікі атрымалі метадычныя і прававыя веды.

Паводле слоў каардынатара па навучанню Тамары Мацкевіч, добра падрыхтавана да кампаніі «Выбірай» жаночая кааліцыя: «Нашыя жанчыны распаўсюджваюць інфармцыю пра выбары, публікуюць матэрыялы ў жаночых газетах і бюлетэнях».

Сымон КІРЫК.

Чарговыя затрыманні маладафронтаўцаў

13 жніўня сябры «Маладога Фронта» мусілі ладзіць прабег у падтрымку Валерыя Шчукіна «У абарону правоў чалавека» па маршруце Мінск-Жодзіна. Але, як вядома, Мінскі абласны выканкам дазволу на яго не даў.

Тым не менш маладафронтаўцы накіраваліся ў Жодзіна, але цягніком.

У Жодзінскім СІЗА перадачу для В.Шчукіна, у якой былі харчы і прэса, не прынялі, маўляў, адну перадачу ў гэтым месяцы ён ужо атрымаў, а, значыць, больш не мае права, толькі лекі.

За 50 м ад будынку СІЗА каля плоту з надпісам «Свабоду Шчукіну» маладафронтаўцы сфатаграфаваліся і зладзілі пікет пад лозунгам «Выбірай Свабоду». Каля іх ездзілі байкеры з бел-чырвона-белымі сцягамі.

Неўзабаве падыйшлі міліцыянты з мэтаю высвятлення асобаў прысутных. Былі затрыманыя і адвезеныя ў мясцовы РАУС: Л.Ачапоўскі, В.Кошалеў, Дз. Мархаток, А.Талстоў, Ф.Корзун (усе з Мінску), Зьм. Чарткоў, П.Красоўскі, А.Уланаў (усе з Жодзіна), В.Барысаў, Зьм. Ляшчынскі, Я.Мурашка (Смалявічы).

У РАУСе міліцыянты склалі тлумачальную, пратрымалі адну гадзіну і ўсіх адпусцілі.

Яе жыццё — ўсім нам прыклад

У Зэльве адбыўся традыцыйны дзень шанавання памяці паэткі Ларысы Геніюш, прымеркаваны да яе 91-га года нараджэння. Сабралася шмат людзей з розных куткоў Беларусі. Нават з Аўстраліі дабраўся наш зямляк Міхась Ляўдар.

Была праведзена багаслужба ў Свята-Траецкай царкве.

Пра Ларысу Антонаўну хораша гаварылі Антаніна Хатэнка, Андрэй Мельнікаў, Мікола Трус, Данута Бічэль, Міхась Скобла, Наталля Матыліцкая, Анатоль Сідарэвіч. Да магілы Ларысы Геніюш былі ўскладзены кветкі.

Мясцовы актывіст грамадскага руху Юры Качук паведаміў, што ў мінулыя гады ў Доме культуры праводзіцца вечар памяці пісьменніцы. Сёлета тутэйшыя вертыкальшчыкі не дазволілі такой імпрэзы. Таму вечарына праходзіла на беразе водасховішча.

Лявон МІНЧЫК.

Паважаныя чытачы «БЕЛАРУСКАГА ЎСХОДУ»!

Ужо няшмат часу засталося да заканчэння падпіскі на IV квартал 2001 года — ўсяго 19 дзён. Падпіска праводзіцца да 25 верасня.

Каб Вам не застацца без «Беларускага Ўсходу» — не адкладвайце афармленне падпіскі на апошнія дні! Спяшайцеся на пошту і выпісвайце «Беларускі Ўсход». Тым часам падкажыце і суседзям, сябрам ды сваякам, каб таксама падпісаліся на гэтую газету.

Падпісны кошт для індывідуальных падпісчыкаў:
на 1 месяц — 451 рубель,
на 2 месяцы — 902 рублі,
на 3 месяцы — 1353 рублі.
Для юрыдычных асоб:
на 1 месяц — 655 рублёў,
на 2 месяцы — 1310 рублёў,
на 3 месяцы — 1965 рублёў.



Аладачкі. **Фота Валерыя БЫСАВА.**

МЫ ЗНОЎ РАЗАМ!

Паважаныя чытачы! Шаноўныя падпісчыкі!

Пасля больш як месячнага перапынку мы зноў з вамі! Калектыў рэдакцыі просіць прабачэння, хоць і не вінаваты ў тым, што газета не выходзіла ажно пяць тыдняў, але такое зараз складанае жыццё, такі цяжкі час. Не ўсё ладзіцца так, як усім нам хацелася б.

Улады робяць усялякія перашкоды, каб праўдзівая інфармацыя, што друкуецца ў нашай газеце аб жыцці народа, не даходзіла да шырокіх слаёў насельніцтва, каб выключыць з інфармацыйнай прасторы незалежную газету. Прэзідэнт выдаў Дэкрэт N 8, які па-свойму успрыняўшы, рацівыя «ахоўнікі парадку» выкарысталі для «выключэння з жыцця» шэрагу недзяржаўных СМІ, у тым ліку і «Беларускі Ўсход», у самы адказны перыяд напярэдадні выбараў Прэзідэнта.

У рэдакцыі газеты «Беларускі Ўсход» міліцыянты 20 ліпеня незаконна забралі камп'ютар, друкарку, тэлефакс. А пракурор раёна папярэдзіў галоўнага рэдактара, што згодна з дэкрэтам яму можа быць прысуджаны штраф ад 50 да 200 мінімальных зыробкаў.

А за што? За якую правіннасць? За тое, што газета дае чытачам праўдзівую інфармацыю, карысныя парады амаль на ўсе выпадкі жыцця? Гэта што — забаронена рабіць? А мо каго пакрыўдзіла газета? Узвяла на каго паклёп? Зняважыла каго? Ці мо якую брахню надрукавалі супрацоўнікі газеты? Кожнаму разумнаму чалавеку добра ведаецца, што такога не было. І кожнаму разумнаму чалавеку зразумела, што тут штосьці не так, не па Закону, а па чыёй-то прыхаці.

Доўга цягнулася разбіральніцтва гэтай справы. Але 15 жніўня суд Хоцімскага раёна вынес адзіна правільную і справядлівую пастанову, у якой запісана: «Справу ў адносінах Даўгалёва Васіля Аляксандравіча па п.п. 1.2 і 5.2 Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь N 8... спыніць па п. 1 ст. 227 КоАП за адсутнасцю саставу адміністрацыйнага парушэння. Адабраныя персанальны камп'ютар, матрычную друкарку, персанальны факс вярнуць карыстальніку Даўгалёву В.А. Пастанова канчатковая і абскарджанню... не падлягае».

Суддзя Азаранка А.В. аказалася на вышыні. Яна служыць Закону, аднаму Закону і толькі Закону.

Рэдакцыя вітае пастанову Суда, дзякуе і шчыра вітае справядлівую суддзю і прыгожую жанчыну Алену Азаранку. Дай Бог ёй здароўя, доўгіх год жыцця і плёну ў працы.

20 жніўня, роўна праз месяц, рэдакцыйнае абсталяванне вярнулася з міліцыі на сваё законнае месца.

Рэдакцыйны калектыў зноў прыступіў да працы і вось сёння вы, паважаныя чытачы, зноў трымаеце ў руках і чытаеце свой «Беларускі Ўсход».

Пяць тыдняў мы не мелі магчымасці інфармаваць вас, дарагія чытачы, аб тым, што адбываецца ў нашай краіне. Не змаглі мы расказаць вам падрабязна пра кандыдатаў у прэзідэнты, пра тое, хто з іх ёсць хто. А дзяржаўныя газеты пра многае мо і не сказалі. Між тым праз тры дні ўсім нам, выбаршчыкам, трэба ісці да выбарчых скрыняў і галасаваць за лёс і свой асабісты, і сваёй краіны, і сваёй дзяржавы. 9 верасня — адказны дзень. Не памыліцеся, людзі! Выбіраць трэба таго, хто зробіць наша жыццё лепшым, хто ўзніме дабрабыт усяго народа, а не жмені прыхватызатараў. Хай вам розум і сэрца падкажуць, за каго галасаваць у лёсаносны дзень выбараў!

Цяпер, калі мы зноў разам, заклікаем чытачоў больш цесна сябраваць з «Беларускім Усходам». Актыўна падпісвайцеся на газету на чацвёрты квартал самі і падкажыце сябрам і знаёмым, якія яшчэ не чыталі «Беларускі Ўсход» ці пакуль не аформілі падпіску, паспяшацца на пошту, бо падпіска заканчваецца 25 верасня.

За жнівень месяц вам, напэўна, ужо вярнулі грошы, а калі не, то патрабуйце ў паштальёнаў ці на пошце. Пошта па просьбе рэдакцыі анулявала падпіску на жнівень месяц і грошы рэдакцыі не пералічвала, бо абавязана вярнуць іх падпісчыкам.

Рэдакцыя.

9 верасня – Дзень выбараў Прэзідэнта РБ
Каго ж выбіраць?







Аляксандр ЛУКАШЭНКА
(Дзеючы Прэзідэнт, кандыдат у прэзідэнты на новы тэрмін)

Нарадзіўся 30 жніўня 1954 года ў г.п. Копысь Аршанскага раёна. Скончыў гістарычны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута (1975) і Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1985). Служыў у памежных войсках (1975-1977) і ва Ўзброеных Сілах СССР (1980-1982). Быў на камсамольскай і савецкай рабоце ў Магілеве (1977-1978), адказным сакратаром Шклоўскай раённай арганізацыі таварыства «Веды» (1978-1980), намеснікам старшыні калгаса «Ударнік», намеснікам дырэктара камбіната будаўнічых матэрыялаў, сакратаром парткома калгаса імя Леніна, дырэктарам саўгаса «Гарадзец» (1982-1990). Дэпутат Вярхоўнага Савета Беларусі (1990-1994). Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь (выбраны 10 ліпеня 1994 г.). З тае пары прайшло сем гадоў.

Сем — лічба астранамічная, астралагічная і містычная: сем дзён стварэння Богам зямлі і жыцця на ёй, сем дзён у тыдні, сем колераў вясёлкі, сем цудаў свету, «сем гадоў багацця і сем гадоў голаду», напрарочаныя Восіпам фараону егіпецкаму.

У нашай краіне сёння не бачна прарокаў, а таму няма каму сказаць людзям, што чакае Беларусь пасля сямі гадоў кіравання краінай Аляксандрам Лукашэнкам, які ўсклаўшы ў ліпені 1994 года руку на канстытуцыю дзяржавы, абяцаў народу дабрабыт, дзяржаве росквіт, краіне незалежнасць. Многа чаго добрага і прыемнага абяцаў. А як выйшла на справе?

Сем гадоў краіна губляла свабоду: слова, друку, сумлення...

Сем гадоў яна губляла эканоміку, міжнародны аўтарытэт.

Спачатку Лукашэнка прасіў 8 месяцаў цярпення людзей, каб даць яму магчымасць справіцца з крызісам у краіне. Ён «цвёрда» абяцаў, што «рост цен и инфляция будут остановлены. С 1 сентября 1994 года цены будут заморожены...»

І ён іх да таго «замарозіў», што яны, бяднягі, каб сагрэцца, пачалі па два, а то і па тры разы за месяц прыгаць угору цэлых сем гадоў запар. А інфляцыя так астанавілася, што дзве дэнамінацыі ажыццёўлены, нулі адкідваліся, адкідваліся на купюрах, а іх і сёння трэба зноў ужо адкідваць — і не адзін, не тры, а нават усе чатыры, каб грошы сталі сапраўды грашамі, а не простымі паперкамі, якімі дзятва «ў грошы гуляе».

Успомніце, пенсіянеры: раней за звычайную 120-рублёвую пенсію вы маглі купіць тры мяхі цукру, а сёння за 60-тысячную пенсію вы не можаце купіць таго ж цукру і два мяхі.

Успомніце, вяскоўцы, як за 1 літар малака, прададзенага дзяржаве, вы маглі купіць бохан хлеба і карабок запалак, а сёння за бохан хлеба вам трэба прадаць ажно тры літры малака. Ды і бохан жа той сёння ўжо не кілаграмовы, а нават не заўсёды і 900 грамаў заважыць.

Во як палепшыўся наш дабрабыт! Во як спынілася інфляцыя!

А вам дзяржаўныя газеты, тэлебачанне і радыё штодзённа распісваюць, як добра нам стала жыць за апошнія 7 гадоў пад правадырствам роднага бацькі Аляксандра Лукашэнкі.

Калі выйшлі ў абарачэнне беларускія «зайчыкі», за іх давалі па чырвонцу расійскіх рублёў. А зараз за расійскі рубель трэба аддаць паўсотню беларускіх.

Аляксандр Рыгоравіч вельмі шчодры на абяцанкі перад выбарамі. Памятаеце, напярэдадні мінулых прэзідэнцкіх выбараў ён абяцаў кожнаму ўкладчыку ў якасці кампенсацыі абясцэненых укладаў па каляроваму тэлевізару? А хто з вас атрымаў гэтыя тэлевізары? А кампенсацыю за згубленыя ўклады атрымалі такую, што хто мог за свае зберажэнні ў свой час купіць легкавушку, купіць змог за «кампенсацыю» не больш як наручны гадзіннік, а хто і таго менш.

І перад цяперашнімі выбарамі Аляксандр Рыгоравіч не скупіцца на абяцанкі заможнага жыцця насельніцтву, росквіту краіне, суверэнітэту дзяржаве...

А што будзе пасля выбараў... Гэта немагчыма прадбачыць. Можна толькі не сумнявацца, што кошт бохана хлеба да новага года падскокне да 500 рублёў, калі не вышэй. А мех цукру коштам мо дацягне і да месячнай пенсіі...

А цяпер пра дабрабыт самога Аляксандра Лукашэнкі. Сукупны гадавы даход яго за 2000 год склаў 3776186 рублёў (у сярэднім за месяц 314682 рублі). Крыніца яго даходаў — кіраўніцтва справамі Прэзідэнта РБ. Мае (сумесна з жонкаю) жылы дом у Шклоўскім раёне агульнай плошчай 115,71 м². Уласнай машыны і дачы не мае.

Уладзімір ГАНЧАРЫК
(Кандыдат у прэзідэнты)

Нарадзіўся 29 красавіка 1940 года ў вёсцы Аўгустава Лагойскага раёна Мінскай вобласці. Скончыў Беларускі інстытут народнай гаспадаркі (1961), аспірантуру Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1976). Працаваў эканамістам, намеснікам в.а. галоўнага бухгалтара саўгаса «10 год БССР» Любанскага раёна Мінскай вобласці (1961-1965). Першы сакратар Любанскага райкома камсамола (1965-1970), інструктар Мінскага абкама КПБ (1970-1971), другі сакратар Дзяржынскага райкама КПБ (1971-1973), першы сакратар Чэрвеньскага райкама КПБ (1976-1982), інспектар, намеснік загадчыка аддзела арг-партработы ЦК КПБ (1982-1984), другі сакратар Магілёўскага абкама КПБ (1984-1986). Старшыня Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў (з 1986), старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларускіх (з 1990), член Выканкама Усеагульнай Канфедэрацыі прафсаюзаў. Кандыдат эканамічных навук (1976) Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1985-1990), Рэспублікі Беларусь (1995-1996), Народны дэпутат СССР (1989-1991).

Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў, медалямі.

Абяцае, калі стане Прэзідэнтам, узняць жыццёвы ўзровень насельніцтва, павысіць міжнародны аўтарытэт краіны, гарантаваць усе грамадзянскія свабоды жыхарам Беларусі, аднаўленне дэмакратычнай сістэмы ўлады, заснаванай на прынцыпах падзелу ўладаў, вяршынства Закону.

Уладзімір Ганчарык абяцае забяспечыць незалежнасць судовай улады і свабоду сродкаў масавай інфармацыі. Будуць створаны спрыяльныя ўмовы для развіцця малога і сярэдняга бізнесу, зніжаны падатковы ціск.

Працоўны люд уздыхне, нарэшце, вольна і зможа зарабляць столькі, каб забяспечыць сабе і сваёй сям'і дастойнае жыццё.

Сукупны гадавы даход Ганчарыка за 2000 год склаў 5315098 рублёў (сярэднемесячны даход 442925 рублёў). Крыніцы даходаў: Федэрацыя Прафсаюзаў Беларуская, міжнародны недзяржаўны інстытут працоўных і сацыяльных адносін, пенсія, даход ад продажу аўтамабіля і гаража.

Зараз уласнай машыны і дачы не мае. Мае мотаблок МТЗ 06 прычэп да яго МТЗ П05. Мае 21 акцыю ААТ ПМК-8 у г. Чэрвені і кватэру ў Мінску (сумесна з жонкаю) агульнай плошчай 75,16 м².

Сяргей ГАЙДУКЕВІЧ
(Кандыдат у прэзідэнты)

Нарадзіўся 8 верасня 1954 года ў Мінску. Скончыў Мінскае вышэйшае інжынерназенітнае вучылішча ППА (1976), юрыдычны факультэт Маскоўскага камерцыйнага інстытута (1997). Палкоўнік запасу. Займаў камандныя пасады ад камандзіра часці да намесніка камандуючага арміі ППА (1976-1991). Працаваў ва Ўпраўленні бяспекі пры Савеце Міністраў Беларусі (1991-1992). Намеснік старшыні камітэта па пытаннях сацыяльнай абароны ваеннаслужачых (1992-1994). У рэкордна кароткі тэрмін стварыў Народны Рух Беларусі (1991-1004) і ліберальна-дэмакратычную партыю Рэспублікі Беларусь, якую ўзначальвае з 1995 года. Мае пад сваім кантролем больш 10 грамадска-палітычных арганізацыяў. Двойчы беспаспяхова ініцыяваў рэферэндум з пытаннем «Ці згодны вы на стварэнне Канфедэрацыі Рэспублікі Беларусь з расійскай Федэрацыяй?» (ліпень-кастрычнік 1998). Кандыдат у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь ад ЛДП (з 1999). Падпісаў платформу апазіцыйных сілаў на перагаворах з уладай пры пасрэдніцтве АБСЕ (жнівень 1999).

Гайдукевіч абяцае ў выпадку абрання яго Прэзідэнтам: дэмакратычны лад жыцця, свабоду прадпрымальніцтва, дружбу з Усходам і Захадам, паляпшэнне дабрабыту ўсяго народа і строгае захаванне законнасці.

У некаторых сродках масавай інфармацыі прамільгнулі звесткі, нібыта Гайдукевіч здыме сваю кандыдатуру на карысць Лукашэнкі. Але сам ён абверг гэтыя чуткі.

Сукупны даход Гайдукевіча за 2000 год склаў 569906 рублёў (у сярэднім 47492 рублі ў месяц). Крыніцы даходаў Сяргея Гайдукевіча: Ліберальна-дэмакратычная партыя і пенсія. Дачы ў яго няма. Ёсць жылы дом (сумесна з жонкаю) у Мінскім раёне агульнай плошчай 201,1 м² і кватэра ў Мінску агульнай плошчай 63,8 м², два аўтамабілі МАЗ 64229032, аўтамабілі БМВ 730 і ГАЗ 3110, 2 прычэпы МТМ 9330.

Паважаныя выбаршчыкі!


З гэтых траіх прэтэндэнтаў на пасаду Прэзідэнта трэба выбраць аднаго.

Ваша права галасаваць за каго хочаце. Гэта і ваша тайна.

Хай вам розум падкажа, каго выбіраць! Толькі памятайце: ад гэтага залежыць наш з вамі лёс і лёс айчыны як у хуткім, так і ў аддалёным будучым.



Программа телевидения



ПОНЕДЕЛЬНИК, 10 сентября
МОГИЛЕВ-1

6.30 «Ранёхонько!»
8.05 «Страна женщин».
8.50 «На пределе». Док. сериал.
9.15 «Большая семья».Кинороман.
10.55 Мультфильмы.
16.30 «Женщина-полицейский».Телесериал.
17.20 Мультфильм.
17.30 «На пределе».Док.сериал.
17.55, 20.00 «Праздник в вашем доме».
19.00 Тяжелый день.
19.20 Телемагазин.
19.30 День области.
19.55 Погода.
21.00 «Виринея».Худ.фильм.
22.45 Новости.
22.55 «Затяжной прыжок».Детектив.

ВТОРНИК, 11 сентября
МОГИЛЕВ-1

6.30,7.10 «Ранёхонько!»
7.00 Утренние новости.
8.05 «Страна женщин».
9.00 Утренние новости.
9.10 «Дикая Америка».
9.35 Мультфильмы.
10.00 Тяжелый день.
10.20 «Скарбы».
11.00 Мультфильмы.
16.30 «Женщина-полицейский».Телесериал.
17.20 Мультфильм.
17.30 «Дикая Америка».
17.55, 21.00 «Праздник в вашем доме».
19.00 Бобруйский вариант.
19.20 Телемагазин.
19.30 День области.
19.40 Погода.
19.45 «Без протокола».
20.00 «Неман - 2001».
21.30 «Страна женщин».
22.15 Новости.
22.25 «Желтый фонтан». Драма.

СРЕДА, 12 сентября
МОГИЛЕВ-1

6.30,7.10 «Ранёхонько!»
7.00 Утренние новости.
8.05 «Страна женщин».
9.00 Утренние новости.
9.10 «Дикая Америка».
9.35 Мультфильмы.
10.24 Бобруйский вариант.
10.44 Мультфильм.
16.30 «Женщина-полицейский».Телесериал.
17.20 Мультфильм.
17.30 «Дикая Америка».
17.55 Спортивный тележурнал.
18.30 «Сегодня на сегодня».
19.20 Телемагазин.
19.30 День области.
19.40 Погода.
19.45 «Без протокола».
20.00 «Праздник в вашем доме».
21.00 «Страна женщин».
21.45 Новости.
21.55 Спорт планеты.

ЧЕТВЕРГ, 13 сентября
МОГИЛЕВ-1

6.30,7.10 «Ранёхонько!»
7.00 Утренние новости.
8.05, 21.00 «Страна женщин».
9.00 Утренние новости.
9.10, 17.00 «Дикая Америка».
9.35 Мультфильмы.
10.11 «Сегодня на сегодня».
11.00 Мультфильмы.
16.30 «Из жизни женщины».
17.30, 20.00 «Праздник в вашем доме».
18.30 «Родны край».
19.20 Телемагазин.
19.30 День области.
19.40 Погода.
19.45 «Без протокола».
21.45 Новости.Погода.
21.55 «Прощай,любовь».Комедия.

ПЯТНИЦА, 14 сентября
МОГИЛЕВ-1


6.30,7.10 «Ранёхонько!»
7.00 Утренние новости.
8.05, 21.00 «Страна женщин».
9.00 Утренние новости.
9.10 «Дикая Америка».
9.35 Мультфильмы.
10.24 «Родны край».
11.14 Мультфильмы.
16.30 «Из жизни женщины».
17.00 «Дознание Да Винчи». Телесериал.
17.40 Мультфильм.
17.55, 20.05 «Праздник в вашем доме».
19.15 Телемагазин.
19.30 Пунктир.
20.00 Погода.
21.50 Новости.Погода.
22.00 Рейтинг-фильм.

СУББОТА, 15 сентября
МОГИЛЕВ-1


15.00 «Все дело в брате». Фильм-детям.
16.20 Мультфильм.
16.35 «С профессиональным праздником!». Ко Дню работников леса.
17.00, 19.00 «Праздник в вашем доме».
18.05 «Дознание Да Винчи». Телесериал.
18.45 Телемагазин.
20.30 «Затворник». Детектив.
22.00 Видеодром.
22.25 «Жанна Д»Арк». Эпическая сага.

ВОСКРЕСЕНЬЕ, 16 сентября
МОГИЛЕВ-1

15.00 «Сказка,рассказанная ночью». Фильм-детям.
16.20 «Черный пират». Мультсериал.
16.45 Мультфильм.
17.00, 19.00 «Праздник в вашем доме».
18.05 «Дознание Да Винчи». Телесериал.
18.45 Телемагазин.
20.30 «Новобранцы на прогулке». Комедия.
22.00 «Однажды вечером». Шоу.
22.50 «Виртуальная тюрьма». Фант. комедия.



Программа телевидения



ПОНЕДЕЛЬНИК, 10 сентября

БТ

6.30 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.40 Новости.
7.10 Доброе утро, Беларусь!
9.10 Резонанс.
10.00 «Морская полиция».
10.45 Телебарометр.
11.05 «Человек моря».
13.10 Сфера.
13.35 «Мальва». Худ.фильм.
15.20 «Жюли Леско».
17.00 «Морская полиция».
18.20 Зона Икс.
18.30 «Тайные пружины политики».
19.00 Комедия «Девять ярдов».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
22.00 «Человек моря».
22.45 Стадион.
23.10 Планета «АРТ».

ОРТ

8.00, 11.00, 17.00, 22.30 Новости.
8.15 «Земля любви».
9.15 Поле чудес.
10.20 Спасатели. Экстренный вызов.
10.50 Библиомания.
14.50 Детектив «Сержант милиции». 1-я серия.
16.00 Большая стирка.
17.20 «С легким паром!»
17.50 «Ералаш».
18.00 «Земля любви».
19.00 Жди меня.
20.00 Время.
20.40 «Закон джунглей».
21.35 «Секретные материалы».
22.55 «На футболе».
23.35 «Полная безопасность».

РТР

7.00, 8.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.15 «Экспертиза РТР».
7.30 «Москва - Минск».
7.45 «Православный календарь».
7.50 Семейные новости.
8.15 Комедия «Гранд-отель».
10.30 «Марсейка,12»".
16.30 «Экспертиза РТР».
17.00 Мелодрама «Возвращение в Эдем».
18.00 «Два рояля».
19.30 Вести-Москва.
19.50 «Пираты». 1-я серия.
21.50 «Фитиль».
22.30 Вести - Москва.
22.40 «Спорт за неделю».
23.40 Фильм «Хочу быть хуже всех».

НТВ

5.00 «Сегодня».
7.50 «Чистосердечное признание».
8.20 «Растительная жизнь».
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00, 23.05 «Сегодня».
9.25 «Намедни».
10.40 «Куклы».
11.20 Комедия «Девушка с характером».
13.45 Ток-шоу «Просто Марина».
15.30 Сериал «Салон красоты».
18.35 «Герой дня».
18.55 Сериал «Дальнобойщики».
20.00 Премьера. «Алчность».
21.55 Сериал «Скорая помощь».
23.30 Премьера НТВ. Гордон.

КУЛЬТУРА

11.30, 13.30 Новости культуры.
11.40 «Братья Карамазовы». Худ. фильм.
13.00 «Поэзия и правда жизни. Сергей Дягилев».
13.45 Вместе с Фафалей.
14.00 Мультсериал.
14.30 Осенние портреты.
15.00 Новости.
15.10 Кино - детям. «Морской лев Солти».
15.30 Мультфильм.
15.45 «Фуга». Док. фильм.

МОГИЛЕВ-1 на БТ

12.15 Пунктир.
12.45 Видеодром.

2 КАНАЛ

7.00 Энергетический завтрак.
8.00 Сейчас.
8.25 Итоги.
9.30 «Все в сад!»
10.00 Сейчас.
10.25 Сериал «Возвращение Сандокана».
13.00 ТВС на польском.
18.00 «Победоносный голос верующего».
18.30 «Питер Пен».
18.55, 19.55, 20.55, 21.55 «Городской вестник».
19.00 Сериал «Убойная сила».
20.00 «Поздравления».
20.35 Тушите свет.
20.45 «В гостях у бабки Агапки».
21.00 «Поздравления».
21.30 Мультфильм.
22.00 Грани.
22.30 Драма «Жизнь другого».
0.10 MTV.

ВТОРНИК, 11 сентября

БТ

6.30 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.50 Новости.
7.10 Доброе утро, Беларусь!
9.15 «Морская полиция».
11.00 «Человек моря».
12.15 Добрый день, Беларусь!
13.00 Прикл. фильм «Мичман Панин».
14.30 «Сокровища мировой культуры».
15.20 «Мой любимый зверь».
15.30 «Все на орбиту!»
15.40 «Маленькие Эйнштейны».
16.05 «Пять чудес».
16.15 «5 х 5».
17.00 «Морская полиция».
18.20 Зона Икс.
18.30 «Москва - Минск».
18.50 Трагикомедия «Лунный папа».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
22.00 «Человек моря».
22.45 Спорт-курьер.
22.55 «Тишина». Док.фильм.
23.20 Ток-шоу «Дела житейские».

ОРТ

8.00, 11.00, 17.00, 22.30 Новости.
8.15 «Земля любви».
9.15 Жди меня.
10.10 Смехопанорама.
10.45 Вкусные истории.
10.50 Библиомания.
14.50 Детектив «Сержант милиции». 2-я серия.
16.00 Большая стирка.
17.20 Русский экстрим.
17.50 «Земля любви».
18.50 «Русский транзит».
20.00 Время.
20.40 Комедия «Шофер поневоле».
22.55 Цивилизация.
23.30 Прикл. фильм «Долгая дуэль».

РТР

8.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
8.15 «Два рояля».
9.00 «Селеста». Телесериал.
10.30 «Санта-Барбара».
16.30 «Экспертиза РТР».
17.00 «Возвращение в Эдем».
18.00 «Аншлаг».
19.30 Вести-Москва.
19.50 «Пираты». 2-я серия.
21.50 «Фитиль».
22.30 Вести - Москва.
22.40 Остросюжетный фильм «Разоблачение».

НТВ

5.00 «Сегодня».
7.50 Сериал. «Дальнобойщики».
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00, 23.05 «Сегодня».
9.25 Наше кино. «Тот самый Мюнхгаузен».
11.25 Детектив «Криминальный талант».
13.45 Ток-шоу «Просто Марина».
15.30 Сериал «Салон красоты».
16.40 Сериал «Скорая помощь».
18.45 Футбол. Лига чемпионов. «Локомотив» (Москва) — «Андерлехт». (Бельгия).
21.55 Сериал «Скорая помощь».
23.30 Гордон.
0.20 «Дневник Лиги чемпионов».
1.05 Футбол. Лига чемпионов. «Рома» (Италия) — «Реал» (Мадрид, Испания).

КУЛЬТУРА

11.30, 13.30 Новости культуры.
11.40 «Братья Карамазовы». Худ. фильм.
12.55 «Поэзия и правда жизни. Сергей Дягилев».
13.45 Вместе с Фафалей.
14.05 Дело житейское.
14.30 Сценограмма. «Дверь в смежную комнату».
15.00 Новости.
15.10 Кино - детям. «Морской лев Солти».
15.30 Мультфильм.
15.50 «Сильнее, чем смерть — любовь». Док. фильм.
16.05 «Ноу-хау».
16.20 «Российский курьер».

МОГИЛЕВ-1 на БТ

10.00 Тяжелый день.
10.20 «Скарбы».

2 КАНАЛ

7.00 Энергетический завтрак.
8.00 Сейчас.
8.25 «Я знаю все!»
9.25 Сериал «Женаты...С детьми...»
10.00 Сейчас.
10.25 «Возвращение Сандокана».
13.00 ТВС на поль-ском.
18.00 «Победоносный голос верующего».
18.30 «Питер Пен».
18.55, 19.55, 20.55, 21.55 «Городской вестник».
19.00 «Убойная сила».
20.00 «Поздравления».
20.35 Тушите свет.
20.45 «В гостях у бабки Агапки».
21.00 «Поздравления».
21.40 «Ракурс».
22.00 Грани.
22.30 Наше кино. «Окно в Париж».
0.40 MTV.

СРЕДА, 12 сентября

БТ

6.30 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.45 Новости.
7.10 Доброе утро, Беларусь!
9.15 «Морская полиция».
10.00 Здоровье.
11.00 «Человек моря».
12.15 Добрый день, Беларусь!
13.00 Худ.фильм «Гонки по вертикали».
14.05 «Сокровища мировой культуры».
15.15 «Приятного аппетита, дети!» Док.сериал.
15.30 «Все на орбиту!»
15.40 «Маленькие Эйнштейны».
16.05 «Пять чудес».
16.15 «5 х 5».
17.00 «Морская полиция».
18.20 Зона Икс.
18.30 Союзное вече.
19.00 Мелодрама «Разговор ангелов».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
22.00 «Человек моря».
22.45 Спорт-курьер.
22.55 Криминальное досье.
23.20 «Встреча в Троицком».

ОРТ

8.00, 11.00, 17.00, 22.30 Новости.
8.15 «Земля любви».
9.15 «Русский транзит».
10.15 Пока все дома.
10.50 Библиомания.
14.50 Детектив «Сержант милиции». 3-я серия.
16.00 Большая стирка.
17.20 Человек и закон.
17.50 «Земля любви».
18.50 «Русский транзит».
20.00 Время.
20.40 Комедия «Большие каникулы».
22.55 Фильм П. Шеремета «Ленинградский метроном».
23.25 Худ. фильм «Язык тела».

РТР

8.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
8.15 «Два рояля».
9.00 «Селеста».
10.30 «Санта-Барбара».
16.30 «Экспертиза РТР».
17.00 «Возвращение в Эдем».
18.00 «Аншлаг».
19.30 Вести-Москва.
19.50 «Пираты». 3-я серия.
21.45 «Фитиль».
22.30 Вести - Москва.
22.40 Детектив «Свет в конце тоннеля».

НТВ

5.00 «Сегодня».
7.30 Комедия «Антон Иванович сердится».
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 «Сегодня».
9.30 Наше кино. «Тот самый Мюнхгаузен».
11.20 Наше кино. «Криминальный талант».
13.45 Ток-шоу «Просто Марина».
15.30 Сериал «Салон красоты».
16.40 Сериал «Скорая помощь».
18.35 «Герой дня».
18.55 Сериал. «Дальнобойщики».
20.00 «Алчность».
21.35 Футбол. Лига чемпионов. «Спарта» (Прага, Чехия) — «Спартак» (Москва).
23.50 Гордон.
0.40 «Дневник Лиги чемпионов».
1.25 Футбол. «Фейеноорд» (Нидерланды) — «Бавария» (Мюнхен, Германия).

КУЛЬТУРА

11.30, 13.30 Новости культуры.
11.40 «Братья Карамазовы». Худ. фильм.
13.00 Жемчужина Кавказа.
13.45 Вместе с Фафалей.
14.00 Мультсериал.
14.25 «Моя антология».
15.00 Новости.
15.10 Кино - детям. «Морской лев Солти».
15.30 Мультфильм.
15.50 «Гари Олдмэн». Док. фильм.

МОГИЛЕВ-1 на БТ

10.24 Бобруйский вариант.
10.44 Мультфильм.

2 КАНАЛ

7.00 Энергетический завтрак.
8.00 Сейчас.
8.25 «Завтрак с Владимиром Соловьевым».
8.50 Катастрофы недели.
9.25 Сериал «Женаты...С детьми...».
10.00 Сейчас.
10.25 «Возвращение Сандокана».
13.00 ТВС на польском.
18.00 «Победоносный голос верующего».
18.30 «Питер Пен».
18.55, 19.55, 20.55, 21.55 «Городской вестник».
19.00 «Убойная сила».
20.00 «Поздравления».
20.30 Тушите свет.
20.40 «В гостях у бабки Агапки».
21.00 «Поздравления».
21.30 Мультфильм.
22.00 Грани.
22.30 Комедия «Жандарм из Сен-Тропе».
0.15 MTV.

ЧЕТВЕРГ, 13 сентября

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 17.00, 23.20 Новости.
9.15 «Острова на далеких озерах». Короткометражный худ. фильм.
9.45 Судьба человека.
11.00, 22.00 «Человек моря».
12.15 Добрый день, Беларусь!
13.00 «Гонки по вертикали». Худ.фильм.
14.05 «Сокровища мировой культуры».
15.15 «Приятного аппетита, дети!» Док.сериал.
15.30 «Все на орбиту!»
15.40 «Маленькие Эйнштейны».
16.05 «Пять чудес».
16.15 «5 х 5».
17.15 Зона Икс.
17.25 Футбол. БАТЭ(Борисов) — «Милан» (Италия). В перерыве и по окончании — Третий тайм.
19.30 Худ.фильм «Любить».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
22.45 Спорт-курьер.
22.55 Королевская охота.

ОРТ

8.00, 11.00, 17.00, 22.30 Новости.
8.15 «Земля любви».
9.15 «Русский транзит».
10.20 Человек и закон.
10.50 Библиомания.
14.50 Комедия «Безумный день».
16.00 Большая стирка.
17.20 «Сами с усами».
17.50 «Земля любви».
18.50 «Русский транзит».
20.00 Время.
20.40 Худ. фильм «Крутые».
21.40 Независимое расследование.
22.55 Формула власти. Президент Франции Ж. Ширак.
23.25 Комедия «Короли шутки».
1.15 Реальная музыка.

РТР

8.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
8.15 «Два рояля».
9.00 «Селеста».
10.30 «Санта-Барбара».
16.30 «Экспертиза РТР».
17.00 «Возвращение в Эдем».
18.00 «Аншлаг».
19.30 Вести-Москва.
19.50 « Пираты». 4-я серия.
21.45 «Фитиль».
22.30 Вести - Москва.
22.40 «Процесс уничтожения» (США). 1998г.
0.30 Горячая десятка.

НТВ

5.00 «Сегодня».
7.50 «Дальнобойщики».
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00, 23.05 «Сегодня».
9.30 Комедия «По семейным обстоятельствам».
11.25 Наше кино. «С вечера до полудня».
13.45 Ток-шоу «Просто Марина».
15.30 Мир кино. «Бум».
18.35 «Герой дня».
18.55 «Дальнобойщики».
20.00 Премьера НТВ. «Внимание! Розыск!»
21.55 «Совершенно секретно. Информация к размышлению».
23.30 Гордон.

КУЛЬТУРА

11.30, 13.30 Новости культуры.
11.40 «Капля в море». Худ. фильм.
12.50 Играет Государственный камерный оркестр России.
13.45 Вместе с Фафалей.
14.00 Мультсериал.
14.30 Русский придворный костюм.
15.00 Новости.
15.10 «Морской лев Солти».
15.30 Мультфильм.
15.45 «Мой убегающий герой». Док. фильм.
16.20 Экспедиция «Чиж».

МОГИЛЕВ-1 на БТ

10.11 «Сегодня на сегодня».

2 КАНАЛ

7.00-9.00 Энергетический завтрак.
15.00 ТВС на польском.
18.00 «Победоносный голос верующего».
18.30 «Питер Пен».
18.55, 19.55, 20.55, 21.55 «Городской вестник».
19.00 «Убойная сила».
20.00 «Поздравления».
20.35 Тушите свет.
20.45 «В гостях у бабки Агапки».
21.00 «Поздравления».
21.30 «Эскулап».
21.40 Мультфильм.
22.00 Грани.
22.30 Наше кино. Комедия «12 стульев».
0.00 MTV.

ПЯТНИЦА, 14 сентября

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.40 Новости.
9.15 «Морская полиция».
10.00 Існасць.
12.15 Добрый день, Беларусь!
13.00 «Гонки по вертикали». Худ.фильм.
14.05 «Сокровища мировой культуры».
15.15 «Приятного аппетита, дети!» Док.сериал.
15.30 «Все на орбиту!»
15.40 «Маленькие Эйнштейны».
16.05 «Пять чудес».
16.15 «5 х 5».
17.00 «Морская полиция».
18.20 Зона Икс.
18.30 «Приказ». Худ. фильм.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
22.00 «Инспектор Шиманский».
23.30 Спорт-курьер.
23.55 Белорусская двадцатка.

ОРТ

8.00, 11.00, 17.00, 22.35 Новости.
8.15 «Земля любви».
9.15 «Русский транзит».
10.15 «Сами с усами».
10.45 Вкусные истории.
10.50 Библиомания.
14.20 Комедия «Лохматый друг».
15.50 «Ералаш».
16.00 Большая стирка.
17.20 Док. детектив. «Шампанское для покойника». Дело 2000 года.
17.50 «Земля любви».
18.50 Поле чудес.
20.00 Время.
20.50 Прикл. фильм «Мотылек».
23.55 Ночной кинозал. «Темная гавань».

РТР

8.00, 10.00, 16.00, 19.00 Вести.
8.15 «Два рояля».
9.00 «Селеста».
10.30 «Санта-Барбара».
16.30 «Экспертиза РТР».
17.00 «Пресс-клуб».
18.00 Сам себе режиссер.
19.30 Вести-Москва.
19.50 Детектив «По данным уголовного розыска».
21.30 Творческий вечер Игоря Николаева.

НТВ

5.00 «Сегодня».
7.50 Сериал «Дальнобойщики».
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 «Сегодня».
9.30 Комедия «По семейным обстоятельствам».
11.25 Наше кино. «С вечера до полудня».
13.45 Ток-шоу «Просто Марина».
15.30 Комедия «Бум-2».
18.40 Премьера НТВ. «Свобода слова».
20.10 «Криминальная Россия». «Охота на слонов».
21.45 «Женский взгляд».
22.30 Комедия «Студентка».

КУЛЬТУРА

11.30, 13.30 Новости культуры.
11.40 Зарубежное док. кино. «Бах — кантор Собора св. Фомы».
13.10 Загадка архива Мандельштама.
13.45 Вместе с Фафалей.
14.00 Мультсериал.
14.30 Малые музеи Санкт-Петербурга.
15.00 Новости.
15.10 Кино - детям. «Морской лев Солти».
15.30 Мультфильм.
15.50 «Город святого креста». Док. фильм.

МОГИЛЕВ-1 на БТ

10.24 «Родны край».
11.14 Мультфильмы.

2 КАНАЛ

7.00 Энергетический завтрак.
8.00 Сейчас.
8.25 «Вы видели».
9.10 Телемагазин.
9.25 Сериал «Женаты... С детьми...».
10.00 Сейчас.
10.25 Сериал «Тело и душа».
13.00 ТВС на польском.
18.00 «Победоносный голос верующего».
18.30 Гарадскія навіны.
18.55, 19.55, 20.55, 21.55 «Городской вестник».
19.00 «Убойная сила».
20.00 «Поздравления».
20.30 Тушите свет.
20.40 «В гостях у бабки Агапки».
21.00 «Поздравления».
21.30 Гарадскія навіны.
22.00 Наше кино. Комедия «12 стульев».
23.30 MTV.

СУББОТА, 15 сентября

БТ

7.00, 9.00, 15.00, 19.00 Новости.
7.10 Існасць.
7.40 Сериал «Река надежды».
8.35 Белорусская двадцатка.
9.15 Экран индийского кино. «Влюбленный воришка».
10.50 Ваше лото.
11.30 Королевская охота.
11.55 Сад мечты.
12.25 «Максим Галкин и друзья».
13.00 Видеофильм «Голоса».
13.25 «Инспектор Шиманский».
15.15 Столица.
15.40 Здоровье.
16.05 Волшебная шкатулка «Союзмультфильма».
17.15 Сериал «Сыщики».
18.10 Судьба человека.
18.35 Из достоверных источников.
19.25 КВН. 1/3 финала Евролиги.
21.00 Панорама.
21.45 Спорт-курьер.
21.55 Тайные пружины политики.
22.20 Худ. фильм «Криминальное чтиво».
0.50 Видимо-невидимо.

ОРТ

7.10 Слово пастыря.
7.25 Звездный час.
7.50 «Микаэл Таривердиев. Мгновения».
8.50 Библиомания.
9.00, 14.00, 17.00 Новости.
9.10 Смехопанорама.
9.45 Смак.
10.05 В мире животных.
10.45 Здоровье.
11.30 «Чтобы помнили...»
12.10 «Ералаш».
12.25 Комедия «Летние сны».
14.10 Детектив. Миссис Бредли: «Лавры и яд».
15.05 Дисней-клуб: «Все о Микки Маусе».
15.30 Док. детектив. «Шампанское для покойника». Дело 2000 года.
16.00 Большая стирка.
17.15 «Ускоренная помощь».
17.50 Комедия «Римские каникулы».
20.00 Время.
20.35 Боевик «Максимальное ускорение».
22.30 Триллер «Змеиный источник».
0.20 Концерт Земфиры.

РТР

7.00 «Папа, мама, я — спортивная семья».
7.45 «Телепузики».
8.10 «Золотой ключ».
8.30 Фильм «Князь Удача Андреевич».
9.50 Сам себе режиссер.
10.25 «Сто к одному».
11.15 Доброе утро страна.
12.00 «Затерянный мир».
13.00, 19.00 Вести.
13.20 Детектив «Пять минут страха».
15.00 Бенефис Ирины Аллегровой.
17.00 Моя семья. «Проблемы молодых людей, или Мальчишник».
17.55 «Аншлаг».
19.25 Зеркало.
20.00 Комедия «Свадебный переполох».
22.05 Фильм «Интервью с вампиром».
0.25 Чемпионат мира по автогонкам в классе «Формула-1». Гран-при Италии Квалификация.

НТВ

7.00, 9.00, 11.00, 15.00, 21.00 «Сегодня».
7.20 «Улица Сезам».
7.45 «Женский взгляд».
8.20 «Без рецепта».
9.15 «Чистосердечное признание».
9.50 «Большие родители».
10.20 «Квартирный вопрос».
11.20 Наше кино. «Неуловимые мстители».
13.00 Мультфильм.
13.25 «Путешествия натуралиста».
14.00 «В поисках утраченного».
15.30 Премьера НТВ. «Ох, уж эти дети!»
16.05 Комедия «Наравне с отцом».
18.25 Премьера НТВ. «На грани безумия».
21.55 «Профессия — репортер».
22.50 Комедия «Вива, Мария!»
1.15 Премьера НТВ. «Кома».

КУЛЬТУРА

9.05 Мультфильм.
9.55 Мой цирк.
10.20 Бабушкины рецепты.
10.35 Золотой пьедестал.
11.00 Графоман.
11.25 «Наш дом». Худ. фильм.
13.00 Мультфильм.
13.10 Архитектурная галерея.
13.30 Новости культуры.
13.45 «Время музыки».
14.10 «Подзёмка». Док. фильм.

2 КАНАЛ

7.00 Энергетический завтрак.
8.20 «Сеть».
8.55 «Я знаю все!».
10.00 Сейчас.
10.30 «Просто звери» с Юлией Проскуриной.
11.10 Кинотеатр ТВ-6. «Бледный всадник».
13.20 Телемагазин.
13.35 Дорожный патруль. Расследование.
14.00 Сейчас.
14.30 «Опасный мир». Программа Андрея Норкина.
15.05 Кинотеатр ТВ-6. «Влюблен по собственному желанию».
16.50 100 чудес света. Ночные львы.
17.55, 18.55, 19.55, 20.55 «Городской вестник».
18.00 «Благая весть с Риком Реннером».
18.30 Мультсериал.
19.00, 20.00 «Поздравления».
21.00 Киноклассика. «Леопард».
0.00 MTV.

ВОСКРЕСЕНЬЕ, 16 сентября

БТ

7.00, 9.00, 15.00 Новости.
7.15 Сериал «Река надежды».
8.05 «Агромир».
8.30 Арсенал.
9.10 Экран индийского кино. «Влюбленный воришка».
10.40 Телевитамин.
11.05 «Все нормально, мама!»
11.45 Мультиклуб.
12.10 Худ. фильм-сказка. «Летние впечатления о планете «Z».
14.25 «Радуга над Витебском».
14.45 «И другие официальные лица».
15.15 Мини-футбол.
15.45 Мир и мы.
16.10 Мелодрама «Родня».
17.40 Криминальное досье.
18.10 «Встреча в Троицком».
18.40 «Время местное».
19.10 Планета «АРТ».
19.40 Телебарометр.
20.00 Резонанс.
20.50 Кинокомедия «Женитьба Бальзаминова».
22.15 Спорт-курьер.
22.25 «Жюли Леско».
23.55 «Максим Галкин и друзья».

ОРТ

7.40 Дисней-клуб: «Русалочка».
8.05 «Ералаш».
8.15 «Ускоренная помощь».
9.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.50 Библиомания.
9.10 «Непутевые заметки».
9.30 Пока все дома.
10.05 «Сами с усами».
10.35 Клуб путешественников.
11.15 Утренняя почта.
11.50 «С легким паром!»
12.20 Худ. фильм «Танцплощадка».
14.10 Детектив. Миссис Бредли: «Шерстяная гадюка».
15.15 Дисней-клуб: «Черный плащ».
15.45 «Ералаш».
15.50 Живая природа.
17.20 «Бронепоезд особого назначения». Спецрепортаж.
17.35 Худ. фильм «Мама».
19.35 Комедия «Час пик».
21.30 Времена.
22.50 Сериал «Тысячелетие».
23.45 Триллер «Год опасной жизни».

РТР

7.05 «Папа, мама, я — спортивная семья».
7.50 Русское лото.
8.40 «Те Бинго шоу».
9.15 «Аншлаг».
10.15 «Городок».
10.50 Доброе утро, страна.
11.30 Фильм «Джокер».
13.00 Вести.
13.20 Диалоги о животных.
14.05 «Вокруг света».
14.50 Чемпионат мира по автогонкам в классе «Формула-1». Гран-при Италии.
17.15 «Марсейка,12». Фильм 6-й. «Бабье лето».
19.00 Вести Недели.
19.55 Фильм «8 1/2 долларов».
22.00 Фильм «Правила боя».
0.10 Комедия «Обнаженная в шляпе».

НТВ

7.00, 9.00, 11.00, 15.00 «Сегодня».
7.15 Наше кино. «Женский день».
9.15 «Криминальная Россия». «Охота на слонов».
9.50 Премьера НТВ. «Большой секрет для маленькой компании».
11.20 Наше кино. «Новые приключения неуловимых».
13.05 Мультфильм.
13.30 «Служба спасения».
14.00 Премьера НТВ. «Своя игра».
15.30 «Я и моя собака».
16.20 Мир кино. «Остров головорезов».
19.00 «Намедни».
20.15 «Куклы».
20.30 Триллер «Семь».
23.05 «Журнал Лиги чемпионов».
23.45 Мир кино. «Рим».

КУЛЬТУРА

9.05 Мультфильм.
10.10 Поэт Н.Усенбаева.
10.35 Ток-шоу «Наобум».
11.00 Тем временем.
11.30 «Вольница». Худ. фильм.
13.10 Власть факта.
13.30 Новости культуры.
13.45 Магия кино.
14.00 Док. фильм.

2 КАНАЛ

7.00 Энергетический завтрак.
8.20 «Star Старт».
8.55 «Все в сад!»
9.25 Завтрак с Владимиром Соловьевым.
10.00 Сейчас.
10.30 Итого.
10.55 «Мое кино».
11.45 Худ. фильм «Когда деревья были большими».
13.30 Телемагазин.
13.45 Дорожный патруль.
14.00 Сейчас.
14.25 Катастрофы недели.
15.00 «Забытый полк».
15.55 «За гранью возможного».
16.50 100 чудес света. Последний пир крокодилов.
17.55, 18.55, 19.55, 20.55, 23.00 «Городской вестник».
18.00 Джойс Майер. «Жизнь в слове».
18.30 Мультфильм.
19.00, 20.00 «Поздравления».
21.00 Комедия «К-9. Собачья работа».
23.20 «Нашествие-2001»: группа «ДДТ».

Гаючая флора

Пятрушка

Ужо Тэафаст раіў ужываць пятрушку з моцным вінам пры жаночых захворваннях, прастатыце, парушэнні менструальнага цыклу. У пятрушцы шмат вітамінаў Е, што добра для спартсменаў, у каго мускулы часцей за ўсё ў напружанні. Пятрушку добра ведалі як лекавую расліну грэкі і рымляне.

Хваліў пятрушку Авіцэнна: «Адкрывае закупоркі венаў, гоніць пот, заспакойвае боль, рассмоктвае пухліны на пачатку іх утварэння, дапамагае ад кашлю, пры сціскانні ў грудзях і цяжкім дыханні, яна карысна для печані і селязёнкі, паляпшае работу страўніка і кішэчніка і выводзіць камяні, але лічыцца, што яна супрацьпаказана пры эпілепсіі. Пятрушка гоніць мачу і месячныя, яна шкодная для цяжарных жанчын. Усе часткі пятрушкі ачышчаюць мачавы пузыр і матку. Карысна пры атручэнні смяротнымі ядамі».

А Пацік сцвярджаў, што «калі насенне пятрушкі растаўчы і змяшаць са свежым нясоленым сметанковым маслам, есці запар тры дні, узмацняе патэнцыю. У гэты час пажадана есці мяса тлустага пеўня і з'есці яго палавыя залозы».

Шарыф з гэтай жа мэтай раіў: «Насенне пятрушкі змяшаць з роўнай колькасцю цукру і бычынай жоўцю».

Для лячэння прастатыту цяжка знайсці што-небудзь лепшае. Летам выкарыстоўваюць свежую расліну. Вырыць корань, адмыць, дробна нашынкаваць.

Рэцэпт: поўную сталовую лыжку заліць паўшклянкай крутога вару, аставіць на ноч (прыкладна на 10 гадзін). Раніцай працадзіць, піць па сталовай лыжцы 4 разы ў дзень за паўгадзіны да яды.

На зіму пажадана насушыць корань. Зімой рыхтуюць наступным чынам:

4 чайныя лыжкі на паўшклянкі кіпеню, настойваюць у тэрмасе не менш 8 гадзін. Піць па сталовай лыжцы за 30 хвілін да яды. Курс лячэння—2,5 месяцы. Гэтага дастаткова, каб зняць запаленне.

Пры вострых стадыях хваробы нырак трэба скараціць ужыванне пятрушкі, а пры цяжарнасці — поўнасцю выключыць з рацыёну.

Моцны адвар пятрушкі з сокам лімона адбельвае скуру твару ад вяснушак і загару.

У пятрушкі выкарыстоўваюць усю расліну: корань, лісце, насенне як свежыя, так і сушаныя.

Традыцыйна пятрушка ўжываецца ў супы. Зеляніна ўваходзіць у састаў «усіх букетаў».

З народнага лячэбніка

Цуды лячэння рэўматызму ўкусамі пчол

Знахары з незапомных часоў лячылі пацыентаў укусамі пчол. Тэхніка лячэння вельмі простая. Звычайна ловяць на кветках пчол, бяруць пчалу за крылы і саджаюць на хворае месца. Пчала тут жа джаліць. Наступнае джаленне робяць праз суткі на вяршок-два ад месца ўкуса ў першы дзень. Першы дзень джаляць адной пчалой, другі дзень — дзьвума, наступны — трыма і так да пяці. Затым даюць хвораму адпачынку дзень-два і праводзяць джаленне ў адваротным парадку: першы дзень — пяць пчол, другі — чатыры і ў апошні дзень джаляць адной пчалой.

Калі хворы яшчэ адчувае рэўматычныя болі, то праз тыдзень паўтараюць курс лячэння. Калі і пасля гэтага хворы не вылечыўся — даюць яму два тыдні адпачынку і праводзяць трэці курс лячэння, але гэта здараецца вельмі рэдка. Звычайна хапае двух курсаў лячэння ўкусамі пчол.

Народны сродак ад нетрымання мачы

Самым надзейным сродкам ад нетрымання мачы народныя лекары спрадвеку лічылі сумесь двух траў святаянніку і цвінтарэю (зверабоя і золататысячніка). Іх трэба браць пароўну, варыць і піць, як гарбату.

Заўвага: *пры частых позвах да мочаспускання выключыць з ужывання сельдэрэй, кавуны, вельмі спелы вінаград і спаржу да тае пары, пакуль ускладненні з мачавым пузыром не пройдуць канчаткова.*

Маладзіцы.

ФОТА Валерыя БЫСАВА.

Вучоныя кажуць:

Снегу будзе яшчэ больш

Ад мацнейшых снегападаў мінулай зімой пацярпелі Расія, ЗША, Канада і частка Заходняй Еўропы. Штосьці падобнае адбывалася на планеце дзесяткі тысяч гадоў назад. Вучоныя сцвярджаюць, што прыродныя катаклізмы яшчэ наперадзе. У дакладзе, над якім працавалі спецыялісты з 99 краін, паведамляецца, што ў наступіўшым стагоддзі тэмпература на зямлі павысіцца на тры градусы. У выніку раставання арктычных леднікоў узровень Сусветнага акіяну павысіцца на цэлых два метры і могуць быць затоплены прыбярэжныя раёны Кітая, Бангладэш і Егіпта, а таксама знікнуць большасць каралавых астравоў. І для нас глабальнае пацяпленне ў бліжэйшы час не абяцае добрага надвор'я, а пагражае тымі ж снежнымі бурамі, навадненнямі, засухамі і рэзкімі перападамі тэмпературы. Пажывем, пабачым, як здзейсняцца прагнозы вучоных.

Куток гаспадыні

Салата з зеляніны з гуркамі

1 пучок пятрушкі, 1 цыбуліна, 2 гуркі, 1 лімон, 2 ст. лыжкі смятаны, соль па смаку.

Гароднінну памыць, пачысціць, нашынкаваць, дадаць сок лімона з дробна нарэзанай мякаццю, пасаліць, паліць смятанай, размяшаць, упрыгожыць зелянінай пятрушкі.

Падобным чынам гатуем салату з кораня пятрушкі, яблыкаў і морквы.

Яешня з зелянінай пятрушкі

1 шкл. малака, 4 яйкі, 2 ст. лыжкі зеляніны пятрушкі, 2 ст. лыжкі мукі, соль.

Яйкі ўзбіць з малаком, пасаліць, дадаць дробна нарэзаную зеляніну пятрушкі. Падрыхтаваную масу выліць на патэльню з разагрэтым маслам.

Казалі мудрыя

Аб палітычных дзеячах і кіраўніках

Калі быў пастаўлены ва ўладу, не выкарыстоўвай пры сябе хітруноў; бо ў чым яны пагрэшуць, за тое абвінавацяць цябе, як начальніка.

Салон.

Чым менш дастойныя дурныя грамадзяне атрымліваемых пасад, тым больш яны становяцца няўважнымі і здзяйсняюцца бязглуздасцю і нахабствам.

Дэмакрат.

Калі чалавек узяўся быць пастухом статку кароў і, памяншаючы і пагаршаючы іх, не прызнаецца, што ён дрэнны пастух, то што яшчэ больш для чалавека недарэчна, калі ён узяўся быць начальнікам у дзяржаве і, памяншаючы і пагаршаючы грамадзян, не саромеецца гэтага і не ўсведамляе, што ён дрэнны начальнік.

Сакрат.

Высокія пасады важных людзей робяць яшчэ больш важнымі, а нікчэмных людзей яшчэ больш нікчэмнымі.

Ж.Лабруйер.

Высокія пасады хутка навучаюць высокі розум.

Л.Вовенарг.

Дробязных людзей трэба ставіць на дробязныя пасады.

Л.Вовенарг.

Хто ўцёрся ў чын лісой,
Той будзе ў чыне воўкам.

В.Жукоўскі.

Чыны не павышаюць,
Калі іх коштам подласці купляюць.

І.Дзмітрыеў.

Нельга называцца палітыкам, калі не валодаеш цярпеннем і здольнасцю стрымліваць гнеў.

Стэндаль.

Чэснасць у палітыцы — ёсць вынік сілы, крывадушнасць — вынік слабасці.

У.Ленін.

Палітычны кіраўнік адказвае не толькі за тое, як ён кіруе, але і за тое, што робяць кіруемыя ім. Гэтага ён іншы раз не ведае, гэтага ён часта не хоча, але адказнасць кладзецца на яго.

У.Ленін.

Анекдоты

Хворы прыходзіць да доктара:

— Доктар, я выпіваю пару бутэлек віна, залажу на бабу, і ў мяне галава кружыцца.

— Да... гэта нядобра. Але выпадак дзіўны. Мо ў бабе справа? Прывядзі яе да мяне.

— Як жа я яе прывяду. Яна ж вялізная, з бронзы, у гарадскім парку стаіць.

* * *

Адной жанчыне сяброўка расказала, як яна была ў Кітаі і якія кітайцы нястомныя ў каханні. Ну і гэтая загарэлася, ўзяла пуцёўку і паехала ў Кітай. Пазнаёмілася там з кітайцам, ён прывёў яе ва ўтульны пакой, леглі...

Толькі кітаец скончыў — скок на падлогу і... пад ложак. Вылязае з другога боку і зноў на жанчыну. І па новай... Тры разы так, чатыры, пяць... На восьмы раз і жанчына завялася: скок з ложка — і пад ложак. А там дзевяць кітайцаў.

* * *

Муж вяртаецца з камандзіроўкі раней звычайнага, заходзіць у спальны пакой — жонка ў ложку, побач з ложкам стаіць голы грузін у картузе і радасна так усміхаецца.

Ахрэнеўшы муж грузіну:

— Ты хто?

Грузін (ужо без усмешкі):

— Ды баран я — учора вось картузневідзімку купіў за штуку баксаў!

Народныя замовы

Ад спужання

1. Блаславі, Госпадзі, раба Божага (такогась). Матухна рака Тацяна, па табе ручаі Беглі, ты львоў змывала, аленяў і вярблюдаў, змый з раба Божага (такогась) усе жахі і болесці, і тугу-маркотушку, каб ён не тужыў, не думаў і не гадаў, спаў і еў, каб яму нікто не здаваўся, не казаўся, каб яго галованька не балела, сэрцайка не ныла, ручанькі не ламіла, па жывату не хадзіла, сам сябе адчуваў. Слава Айцу і Сыну і Святаму Духу! Амін! Амін! Амін!

2. Не я вычытываю, вычытвае Маці Прасвятая Багародзіца, усе жахі і болесці, і тугу-маркотушку, каб не тужыў, не гараваў і не думаў, і не гадаў, каб нікто яго не турбаваў, каб яго галованька не балела, сэрцайка не ныла, ручанькі-ножанькі не ламіла і па жывату не хадзіла.

Слава Айцу і Сыну і Святаму Духу! Амін! Амін! Амін!

Заўвага: *Калі такое непрыемнае захворванне, як эпілепсія, узнікла ад спужання, то раяцца таксама гэтыя замовы.*

"Беларускі Ўсход"

Грамадска-палітычная і літаратурна-мастацкая газета.

На беларускай і рускай мовах.

Заснавальнік — рэдакцыя газеты «Беларускі Ўсход».

Галоўны рэдактар Васіль ДАЎГАЛЁЎ

Адрас: в.Маркаўка, Хоцімскі р-н, Магілёўская вобл., 213670.
Тэлефон галоўнага рэдактара 22-9-89

Рэгістрацыйны N 141
Падпісны індэкс — 64098

Пункт гледжання аўтараў надрукаваных матэрыялаў можа не супадаць з пазіцыяй рэдакцыі.

За дакладнасць фактаў, падзеяў, прозвішчаў і іншай інфармацыі адказваюць аўтары апублікаваных матэрыялаў.

Газета падпісана да друку ў 16 гадзін 5 верасня 2001 г.
Надрукавана ў Магілёўскай абласной друкарні, вул. Першамайская, 70.
Наклад 2893 ас. Аб'ём 1 друк. аркуш. **Заказ № 31.**